УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ДУДЗІЦКІ УЛАДЗІМІР (ГУЦЬКА УЛАДЗІМІР ЕРМАЛАЕВІЧ)

## ПАЭТ, ПРАЗАІК, ПУБЛІЦЫСТ, ПЕРАКЛАДЧЫК, ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ

**8 СТУДЗЕНЯ 1911 – ПАСЛЯ 1976**

**ФОНД № 507**

**ВОПІС № 1**

**1933 – 1994**

**МІНСК 2019**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 507**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1 | РУКАПІСЫ У. ДУДЗІЦКАГА | 1 - 8 | 1 - 2 |
| 1.1 | ВЕРШЫ | 1 - 5 | 1 |
| 1.2 | АПОВЕСЦЬ, АРТЫКУЛЫ, СЦЭНАРЫЙ РАДЫЁПЕРАДАЧЫ | 6 - 8 | 1 - 2 |
| 2 | ПЕРАКЛАДЫ ТВОРАЎ У. ДУДЗІЦКАГА | 9 - 10 | 2 |
| 3 | ТВОРЫ, САБРАНЫЯ ДА ВЫДАННЯ: У. ДУДЗІЦКІ. "НАПЯРЭЙМЫ ЖАДАНЬНЯМ". ЗБОР ТВОРАЎ. (УКЛ. І РЭДАКТАР Л. ЮРЭВІЧ. БІБЛ. І КАМЕНТАРЫ А. ЮРЭВІЧ. НЬЮ-ЁРК,1994) | 11 - 33 | 2 - 5 |
| 4 | ПЕРАПІСКА | 34 - 40 | 5 - 6 |

**Прадмова**

Уладзімір Дудзіцкі (Уладзімір Ермалаевіч Гуцька) нарадзіўся 27.12.1910 г. (08.01.1911 г.) у в. Дудзічы Ігуменскага павета Мінскай губерніі (цяпер Чэрвеньскі р-н) у сялянскай сям'і. У 1926 г. ён скончыў чатырохгадовую народную школу ў в. Дудзічы, потым – сямігадовую школу № 22 г. Мінска. Паступіў у Мінскі педтэхнікум імя Ус. Ігнатоўскага (1930), адкуль яго выключылі як "нацдэма". З дапамогай беларускіх пісьменнікаў Л. Калюгі, У. Хадыкі ўладкаваўся на працу стыльрэдактарам у газету "Савецкая Беларусь" і перакладчыкам у Навукова-тэхнічным выдавецтве. Адначасова ён вучыўся на літаратурна-лінгвістычным факультэце Вышэйшага педагагічнага інстытута . 23.02.1933 г. быў арыштаваны НКВД і асуджаны да трох гадоў лагераў. Пакаранне адбываў у Навасібірску, Марыінску (1934-1935). Пасля атрымаў год ссылкі ў Сярэднюю Азію (г. Ташкент), дзе жыў да канца 1937 г. і адкуль яго датэрмінова вызвалілі з прычыны захворвання на малярыю. Паводле загаду Мінскага НКУС ён павінен быў выехаць у Віцебск ці Барысаў. Ён абраў Віцебск, дзе працаваў у газеце "Віцебскі пралетары", а потым да канца 1940 г. выкладаў беларускую мову ў розных навучальных установах горада пакуль яго не звольнілі, бо "не патрапіў забяспечыць партыйнасці пры выкладанні беларускай мовы і літаратуры". Некаторы час жыў у Расіі. Пасля доўгіх пошукаў працы У. Дудзіцкі трапіў у Ветэрынарны тэхнікум у вёсцы Курасоўшчына пад Мінскам. У гады акупацыі У. Дудзіцкі жыў у Мінску, Барысаве. У 1941 – 1942 гг. ён займаў пасаду загадчыка аддзела культуры Мінскай гарадской управы, у 1942 г. – аналагічную пасаду ў гарадской управе г. Барысава і ўзначальваў "Беларускую народную самапомач". У 1943 г. пераехаў у Мінск. Увайшоўшы ў склад створанай акупантамі Беларускай цэнтральнай рады (БЦР), узначальваў аддзел прапаганды вайсковага фарміравання Беларускай краявой абароны, з'яўляўся сябрам Цэнтральнага ўрада Беларускага культурнага згуртавання. У красавіку 1944 г. яго абралі кіраўніком аддзела прапаганды беларускай культуры Беларускага культурнага згуртавання. Ён актыўна супрацоўнічаў з беларускамоўнымі выданнямі, утворанымі пры падтрымцы акупацыйных улад. У 1944 г. У. Дудзіцкі выехаў у Германію. Напачатку жыў у Берліне і папранейшаму працаваў у БЦР. Закончыў курсы нямецкіх прапагандыстаў. У лістападзе 1944 г. выйшаў са складу БЦР і ўзначаліў ва ўласаўскіх войсках так званую беларускую групу пры аддзеле прапаганды. Напрыканцы Другой сусветнай вайны служыў у прапагандысцкім органе "Вінета" пры ўсходнім аддзеле Міністэрства прапаганды Германіі. Калі вайна скончылася, нейкі час

жыў у лагерах для перамешчаных асоб у амерыканскай акупацыйнай зоне. Потым перасяліўся ў Венесуэлу. Знайшоў працу ў Міністэрстве будоўлі садоў і паркаў у якасці садоўніка. Атрымаўшы запрашэнне працаваць у беларускай рэдакцыі радыёстанцыі “Свабода”, у 1956 г. пераехаў у Мюнхен. У 1962 г. эміграваў у ЗША, дзе працаваў пазаштатным карэспандэнтам Радыё “Вызваленне”, выкладчыкам рускай мовы ва ўніверсітэце г. Блумінгтана (штат Індыяна). Неўзабаве вярнуўся ў Венесуэлу. І гэта апошнія дакладныя звесткі пра пісьменніка. Яго сляды губляюцца пасля 1976 году. Дакладнай інфармацыі пра месца і дату яго смерці няма. Рэабілітаваны ў 1956 г. па крымінальнай справе за 1933 г.

У. Дудзіцкі пачаў друкавацца ў 1937 г. У час нямецкай акупацыі Беларусі выступаў з паэмамі, вершамі, артыкуламі ў газетах “Новая дарога”, “Голас вёскі”, “Беларуская газета”, “Беларускі работнік”, часопісах “Новы шлях”, “Раніца”. Апынуўшыся за межамі Бацькаўшчыны, друкаваўся ў эміграцыйных газетах “Беларус”, “Бацькаўшчына”, часопісах “Божым шляхам”, “Пагоня”, “Шыпшына”, “Моладзь”, “Конадні”, у альманаху беларускіх эміграцыйных паэтаў і пісьменнікаў “Ля чужых берагоў” (Мюнхен, 1955). Валодаў англійскай, іспанскай, нямецкай мовамі. Займаўся перакладамі твораў Т.Р. Шаўчэнкі на беларускую мову. У 1994 г. у Нью-Йорку выйшаў Збор твораў пісьменніка “Напярэймы жаданьням”, у 2010 г. – “Творы”, найбольш поўнае выданне творчай спадчыны У. Дудзіцкага.

Большая частка дакументаў з асабістага архіву У. Дудзіцкага была перададзена ў БДАМЛМ В. Кіпелем у 1999 г. Пераважна матэрыялы былі атрыманы БІНіМам ад сям’і пісьменніка для падрыхтоўкі да выдання Збору твораў паэта “Напярэймы жаданьням” (Нью-Ёрк,1994) і архівіста Л.Н. Юрэвіча. Асобныя аўтографы, пісьмы са збораў БІНіМа былі перададзены праз намесніка дырэктара БДАМЛМ Н.С. Гардзіенка ў 2014, 2018 гг.

У 2019 г. у выніку НТА быў складзены воп. №1 ф. №507 У. Дудзіцкага ў колькасці 40 спраў (190 дак.) за 1933 – 1994 гг.

Вопіс складаецца з 4 раздзелаў.

1. Рукапісы У. Дудзіцкага маюць 2 падраздзелы. Справы сістэматызаваны па жанрах, а ўнутры жанраў – па храналогіі. У падраздзел 1.1 увайшлі ”Выбраныя вершы” для публікацыі ў газеце “Бацькаўшчына”, вершы, падборкі вершаў, накіды да іх за 1933 – 1962 гг. Падраздзел 1.2 склалі: урыўкі з аповесці У. Дудзіцкага (пад псеўданімам М. Дварэцкі) “Голас крыві”, артыкулы, нататкі “Беларускае Культурнае Згуртаванне”,

“Гістарычная дата”, “На тле зруйнаваных святынь” і інш., артыкул і сцэнарый радыёперадачы “Педагагічныя ідэі Яна Амоса Каменскага”. (1946-1962)

2. У раздзеле змешчаны вершы У. Дудзіцкага ў перакладзе Г. Рыдмюлера, Ю. Лабадоўскага, Б. Аляксандрава на нямецкую, польскую і ўкраінскую мовы. (1943-1954)

3. Раздзел склалі сабраныя і сістэматызаваныя Лявонам і Аленай Юрэвічамі творы У. Дудзіцкага да Збору твораў “Напярэймы жаданьням” (укладальнік і рэдактар Л. Юрэвіч, бібліяграфія і каментары А. Юрэвіч, Нью-Ёрк, 1994): аўтографы, машынапісы з аўтарскай праўкай, газетныя выразкі, ксеракопіі твораў У. Дудзіцкага, некаторыя – у шматлікіх варыянтах. Раздзел сабраў вершы, цыклы вершаў, паэмы, пераклады твораў Т.Р. Шаўчэнкі на беларускую мову, прозу эміграцыйнага пісьменніка.

4. У раздзеле змешчаны: пісьмы У. Дудзіцкага да Я. Запрудніка, М. Кавыля, В. Тумаша, пісьмы К. Мерляка да У. Дудзіцкага.

За раздзелам знаходзяцца ўспаміны А. Крэйн (дачкі У. Дудзіцкага) пра бацьку на англійскай мове, пісьмо Веры фон Доп да В.Я. Кіпеля аб выданні Збора твораў пісьменніка, фатаграфіі У. Дудзіцкага, індывідуальныя.

Прадмову склала Евенка І.А.

вяд архівіст

18.01.2019

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1 РУКАПІСЫ У. ДУДЗІЦКАГА** | | | | |
| | **1.1 ВЕРШЫ** | | | | |
| 1 | "Выбраныя вершы". Падборка вершаў да публікацыі ў газеце "Бацькаўшчына". Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1955 | 8 | 1/5 | |
| | * * * | | | | |
| 2 | "Ліст да маці", "Ліст да сястры", "Мая родная, любая, кволая...", "На папялішчы руж", "Спрытныя жарты", "Цяпер і я пазнаў сваю віну...", "Я шукаў цябе - не знайшоў..." і інш. Вершы. Варыянты. Аўтограф | 1933-1962 | 59 | 51 | |
| 3 | "Даты і іксы", "Ні маністаў ні зораў", "Прыдзі", "Пякельны дар", "Я з песняй упоруч пайду..." і інш. Вершы, падборкі вершаў. Выразкі з газет, ксеракопіі выразак з газеты "Бацькаўшчына", часопісаў "Божым шляхам", "Пагоня", "Шыпшына" і інш. | 1946-1953 | 12 | 14 | |
| | * * * | | | | |
| 4 | "Адкрываць не ўмею ніякіх Амерык я...", "Вечарэла, стомлены, ля ганку...", "Гавораць, што ўсё не гнуся я...", "З расколін чэрвеньскага землятрусу..." і інш. Вершы, накіды да вершаў. А - М. Аўтограф | [1930-я-1950-я гг] | 32 | 32 | |
| 5 | "Стомлены цяжкімі думамі...", "Ці варта караць за нямудрае...", "Чужое гора вымераць нялёгка..." і інш. Вершы, накіды да вершаў. Н - Я. Аўтограф, машынапіс | [1930-я-1950-я гг] | 39 | 40 | |
| | **1.2 АПОВЕСЦЬ, АРТЫКУЛЫ, СЦЭНАРЫЙ РАДЫЁПЕРАДАЧЫ** | | | | |
| 6 | М. Дварэцкі. "Перад бурай", "У палоне думак". Урыўкі з аповесці "Голас крыві". Выразкі з часопіса "Пагоня" | 1946 | 4 | 2 | |
| 7 | "Беларускае Культурнае Згуртаванне", "Гістарычная дата", "На тле зруйнаваных святынь" і | 1944-1951 | 34 | 12 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | інш. Артыкулы, нататкі.<br>Машынапісныя копіі, ксеракопіі машынапісу і выразак з газет | | | | |
| 8 | "Педагагічныя ідэі Яна Амоса Каменскага". Артыкул, сцэнарый радыёперадачы да 370-й гадавіны з дня нараджэння .<br>Машынапіс | 1962 | 11 | 2 | |
| | **2 ПЕРАКЛАДЫ ТВОРАЎ У. ДУДЗІЦКАГА** | | | | |
| 9 | У. Дудзіцкі. "Дваццаць пяць". Верш. У перакладзе Г. Рыдмюлера на нямецкую мову.<br>Ксеракопія выразкі з газеты | 1943 | 3 | 2 | |
| 10 | У. Дудзіцкі. "Oda". Верш. У перакладзе Ю. Лабадоўскага на польскую мову.<br>"Живе, невмирущее слово". Верш. У перакладзе Б. Аляксандрава на ўкраінскую мову.<br>Выразка з газеты, ксеракопія выразкі з часопіса.<br>Прыкладзены вершы Ю. Лабадоўскага ў перакладзе Н.А. Арсенневай, В. Бірыча (А.Я. Адамовіча) на беларускую мову | 1945,1954 | 5 | 5 | |
| | **3 ТВОРЫ, САБРАНЫЯ ДА ВЫДАННЯ: У. ДУДЗІЦКІ. "НАПЯРЭЙМЫ ЖАДАНЬНЯМ". ЗБОР ТВОРАЎ. (УКЛ. І РЭДАКТАР Л. ЮРЭВІЧ. БІБЛ. І КАМЕНТАРЫ А. ЮРЭВІЧ. НЬЮ-ЁРК,1994)** | | | | |
| 11 | "Напярэймы жаданьням". Падборка вершаў У. Дудзіцкага да мяркуемага Збора твораў. (Укл. і рэдактар Л. Юрэвіч. Бібл. і каментары А. Юрэвіч. Нью-Ёрк, 1994). Варыянты. 1929-1939.<br>Ксеракопіі аўтографа, машынапіс з рэдактарскай праўкай | 1994 | 99 | 1/84 | |
| 12 | "Напярэймы жаданьням". Падборка вершаў У. Дудзіцкага да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1941-1943.<br>Машынапіс з аўтарскай і рэдактарскай праўкай | 1994 | 105 | 0/89 | |
| 13 | "Напярэймы жаданьням". Падборка вершаў У. Дудзіцкага да мяркуемага Збора твораў. "Дваццаць пяты". Верш. Варыянты. 1943-1944.<br>Ксеракопіі машынапісу з аўтарскай праўкай, машынапіс, рукапіс рэдактара, выразка з газеты.<br>Прыкладзена "Беларуская газета" (№24) ад 25.03.1944 г. з вершам У. Дудзіцкага "Дваццаць пяты" | 1994 | 13 | 0/8 | |
| 14 | "Напярэймы жаданьням". Падборка вершаў У. Дудзіцкага да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. | 1994 | 33 | 0/37 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1944.<br>Ксеракопіі аўтографа, машынапісу з аўтарскай праўкай, рукапіс А. Юрэвіч | | | | |
| 15 | "Напярэймы жаданьням". Падборка вершаў У. Дудзіцкага да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1945.<br>Ксеракопіі аўтографа, машынапісу з аўтарскай праўкай, машынапіс з аўтарскай праўкай, рукапіс А. Юрэвіч | 1994 | 49 | 0/42 | |
| 16 | "Напярэймы жаданьням". Падборка вершаў У. Дудзіцкага да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1946-1949.<br>Ксеракопіі аўтографа, машынапісу з аўтарскай праўкай, машынапіс з аўтарскай праўкай, рукапіс А. Юрэвіч | 1994 | 46 | 0/41 | |
| 17 | "Напярэймы жаданьням". Падборка вершаў У. Дудзіцкага да мяркуемага Збора твораў. Варыянты.1950-1962.<br>Ксеракопіі аўтографа, машынапісу з аўтарскай і рэдактарскай праўкай | 1994 | 46 | 0/39 | |
| 18 | "Напярэймы жаданьням". "З незавершанага". Падборка вершаў У. Дудзіцкага да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. [1930-я-1950-я гг].<br>Ксеракопіі аўтографа, машынапісу з аўтарскай праўкай, рукапіс А. Юрэвіч | 1994 | 62 | 0/61 | |
| 19 | "Напярэймы жаданьням". Цыкл вершаў У. Дудзіцкага "Жывое праўдзівае слова" да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1933-1943.<br>Машынапіс, ксеракопія машынапісу з паметамі і рукапіс Л.Н. Юрэвіча | 1994 | 12 | 0/9 | |
| 20 | "Напярэймы жаданьням". Цыкл вершаў У. Дудзіцкага "Песні няволі: Горкія ўспаміны" да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1933-1943.<br>Машынапіс, ксеракопія машынапісу, рукапіс Л.Н. Юрэвіча | 1994 | 13 | 0/13 | |
| 21 | "Напярэймы жаданьням". Цыкл вершаў У. Дудзіцкага "Да родных, блізкіх і далёкіх" да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1955.<br>Машынапіс, ксеракопіі аўтографа, машынапісу з рэдактарскай праўкай | 1994 | 12 | 0/11 | |
| 22 | "Напярэймы жаданьням". Цыкл вершаў У. Дудзіцкага "Глухія шчасця крокі" да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1955. | 1994 | 8 | 0/11 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Ксеракопіі машынапісу, выразкі з друкаванага выдання | | | | |
| 23 | "Напярэймы жаданьням". Цыкл вершаў У. Дудзіцкага "Журботныя струны" да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1947-1955. Машынапіс, ксеракопія машынапісу, рукапіс А. Юрэвіч | 1994 | 30 | 0/28 | |
| 24 | "Напярэймы жаданьням". Паэма, урыўкі з паэмы У. Дудзіцкага "Звер двуногі" да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1944-1955. Машынапіс з аўтарскай праўкай, ксеракопіі аўтографа, выразак з друкаваных выданняў з рэдактарскай праўкай | 1994 | 66 | 0/17 | |
| 25 | "Напярэймы жаданьням". Паэма, урыўкі з паэмы У. Дудзіцкага "Клятва духу"="Прысяга" да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1944. Машынапіс, ксеракопіі выразак з друкаваных выданняў з рэдактарскай праўкай | 1994 | 46 | 0/6 | |
| 26 | "Напярэймы жаданьням". Паэма, урыўкі з паэмы У. Дудзіцкага "Маіх уяў ружовых ранак" да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1946. Машынапіс з аўтарскай праўкай, ксеракопіі машынапісу з аўтарскай і рэдактарскай праўкай, выразак з друкаваных выданняў | 1994 | 11 | 0/6 | |
| 27 | "Напярэймы жаданьням". Паэма, урыўкі з паэмы У. Дудзіцкага "Сцені" да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1947. Ксеракопія аўтографа, машынапіс з аўтарскай і рэдактарскай праўкай | 1994 | 15 | 0/5 | |
| 28 | "Напярэймы жаданьням". Т.Р. Шаўчэнка. "Каўказ". Паэма. Урывак. "Запавет", "Мінаюць дні, мінаюць ночы", "На вечную памяць Катлярэўскаму", "Не грэе сонца на чужыне" і інш. Вершы, урыўкі з вершаў. У перакладзе У. Дудзіцкага з украінскай мовы да мяркуемага Збора твораў. Варыянты. 1947. Машынапіс з аўтарскай праўкай, ксеракопіі машынапісу | 1994 | 17 | 0/11 | |
| 29 | "Напярэймы жаданьням". "Успаміны". Варыянты раздзелаў успамінаў У. Дудзіцкага да мяркуемага Збора твораў. Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай , ксеракопіі аўтографа, машынапісу, выразак з часопісаў | 1994 | 114 | 0/15 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 30 | "Напярэймы жаданьням". "Сэрца Паўла Бурэ", "Куды вочы глядзяць". Апавяданне, абразок У. Дудзіцкага да мяркуемага Збора твораў. 1957,1958.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай і рэдактарскай праўкай | 1994 | 31 | 0/2 | |
| | * * * | | | | |
| 31 | Заўвагі У. Дудзіцкага да надрукаваных яго вершаў у газеце "Бацькаўшчына" за 1953-1955 гг. | 1955 | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 32 | "Ля чужых берагоў". Альманах твораў беларускіх эміграцыйных паэтаў і пісьменнікаў. Змест вершаў У. Дудзіцкага, якія у яго ўвайшлі.<br>Ксеракопія | 1955 | 3 | 1 | |
| 33 | Змест твораў, надрукаваных у часопісах "Пагоня" (№3, 1946), "Конадні" (№3,1955) у т.л. У. Дудзіцкага.<br>Машынапіс, ксеракопія выразкі з часопіса.<br>Прыкладзены ўрывак з нарыса Р. Склюта (А. Адамовіча) з упамінаннем пра У. Дудзіцкага - ксеракопія выразкі з часопіса | | 5 | 3 | |
| | **4 ПЕРАПІСКА** | | | | |
| 34 | Пісьмы У. Дудзіцкага да Я. Запрудніка | 1957-1961 | 7 | 6 | |
| 35 | Пісьмы У. Дудзіцкага да М. Кавыля - рэдактара часопіса "Беларуская думка" аб супрацоўніцтве | 1961-1966 | 4 | 4 | |
| 36 | Пісьмы У. Дудзіцкага да В. Тумаша | 1955,1958 | 3 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 37 | Пісьмы К. Мерляка да У. Дудзіцкага (3).<br>Прыкладзены пісьмы А. Губэрта (бацькі жонкі) да К. Мерляка | 1956 | 8 | 6 | |
| | * * * | | | | |
| 38 | Успаміны А. Крэйн пра У. Дудзіцкага (бацьку). На англійскай мове.<br>Машынапіс.<br>Нявызначаны аўтар. "Справа Дудзіцкага". Нататка. Накіды.<br>Аўтограф | 1957,1994 | 4 | 2 | |
| 39 | Пісьмо В. фон Доп да В.Я. Кіпеля наконт выдання | 1994 | 3 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Збора твораў У. Дудзіцкага | | | | |
| | * * * | | | | |
| 40 | Фатаграфіі У. Дудзіцкага, індывідуальныя. З дароўным надпісам Ю. Віцьбічу | 1949 | 2 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 40 (сорак)

спраў з № 1 па № 40 , 190 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.